***Я. У. Гусінец***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# АСАБЛІВАСЦІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ НАВУКОВА-АДУКАЦЫЙНЫХ КЛАСТАРАЎ

У наш час застаецца актуальнай праблема падрыхтоўкі канкурэнтаздольнага выпускніка, рашэнне якой прадугледжвае фармаванне належнай інфраструктуры. Усё больш прыкметную ролю пачынаюць адыгрываць навукова-адукацыйныя кластары, галоўная задача якіх заключаецца ў тым, каб зблізіць адукацыйны працэс з прадпрыемствам – заказчыкам кваліфікаваных кадраў, а таксама павялічыць канкурэнтаздольнасць усёй сістэмы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Варта адзначыць, што ўзаемаадносіны суб'ектаў навукова- адукацыйнага кластара абумоўлены рухам інфармацыйных і фінансавых патокаў. У выніку змест дзейнасці кожнага суб'екта вызначаецца структурай навукова-адукацыйнага кластара.

Навукова-адукацыйны кластар павінен увайсці ў эканоміку рэгіёна, умацоўваючы яе і знаходзячыся на стыку з іншымі кластарамі.

«Прадуктыўнае функцыянаванне кластара вызначана ужываннем механізму бягучага абнаўлення зместу адукацыі, запатрабаванага для інтэграцыі навучання і вытворчасці, укараненнем новых форм узаемадзеяння паміж адукацыйнымі арганізацыямі і сацыяльнымі партнёрамі» [1, с.89].

Вывучыўшы прыроду, структуру і прыкметы кластара, вызначым асноўныя прыкметы навукова-адукацыйнага кластара. Д.І. Калашнікаў адметнай якасцю лічыць аб'яднанне ў ім адукацыйнага і прамысловага сектараў эканомікі, а менавіта сетку адукацыйных арганізацый, створаную па прынцыпах кластара і групоўка бізнэс-структур вакол названай сеткі [2, с.7].

Пры апісанні складу навукова-адукацыйных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кластараў варта ахарактарызаваць функцыянальныя асаблівасці яго структурных элементаў. Да элементаў адукацыйнага кластара часта належаць: органы дзяржаўнай

улады, камерцыйныя структуры, адукацыйныя і навуковыя ўстановы, іншыя грамадзянскія інстытуты. Наяўнасць у кластары органаў дзяржаўнай улады і іншых адпаведных арганізацый патрабуецца для задавальнення адмысловых запатрабаванняў удзельнікаў і ўсталяванні механізму супрацоўніцтва, апісанага наступным чынам:

1. Ядро кластара назапашвае вакол сябе яго ўдзельнікаў, прадстаўленых не толькі адукацыйнымі арганізацыямі і навуковымі цэнтрамі, але і камерцыйнымі прадпрыемствамі розных галін.

Такім чынам, ядро кластара фармуе вакол сябе аб'яднанні двух відаў: камерцыйных прадпрыемстваў, адукацыйных і навуковых арганізацый. Асноўнай задачай ядра з'яўляецца наладжванне супрацоўніцтва з камерцыйнымі структурамі, зацікаўленымі ў паслугах кластара.

2. Ствараючы неабходнае аб'яднанне удзельнікаў, адукацыйны кластар уяўляе адпаведныя перадумовы для станаўлення сферы тэхналогій і адукацыйных паслуг. У сувязі з гэтым тэхналагічная спецыялізацыя камерцыйных прадпрыемстваў вызначае накіраванасць адукацыйных арганізацый.

Бізнэс вызначае тэхналогію вытворчасці, якая арыентуе на ўдасканаленне адукацыйных праграм. Выбар тэхналогій забяспечваецца апошнімі дасягненнямі прагрэсу і іх даступнасцю, наяўнай кваліфікацыяй кадраў.

3. Адукацыйныя арганізацыі задавальняюць попыт бізнэсу і прадпрыемстваў на спецыялізаваныя кадры. Функцыя адукацыйных арганізацый заключаецца ў падрыхтоўцы канкурэнтаздольных выпускнікоў з мэтай іх прадуктыўнага выкарыстання на вытворчасці. Рашэнне дадзенай задачы становіцца магчымым, калі навучанне грунтуецца на актуальных ведах і бесперапыннасці адукацыі.

4. Прадпрыемствы падчас стварэння ўласных прадуктаў выкарыстоўваюць

тэхналогіі (прадстаўленыя вядучымі ВНУ ці навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

даследчымі інстытутамі), для засваення якіх персанал атрымлівае патрэбную спецыялізацыю. Адпаведна ім вызначаюцца адукацыйныя стандарты і праграмы павышэння кваліфікацыі.

5. Камерцыйныя кампаніі ўяўляюць сабой пляцоўкі для ўкаранення перспектыўных тэхналогій.

Эфектыўнасць навукова-адукацыйнага кластара залежыць ад скаардынаваных сувязей паміж асноўнымі суб'ектамі інтэграцыйнай сістэмы «адукацыя – навука – вытворчасць».

Вольны доступ да рэсурсаў, інфармацыі і крэдытаў з'яўляецца галоўнай умовай паспяховага развіцця прадпрымальніцтва ў рэгіёне. Узнікаючыя праблемы могуць быць вырашаны пры ўваходжанні прадпрыемстваў у кластары. Калашнікаў Д.І. лічыць, што «выгады, якія атрымае асобнае прадпрыемства ад развіцця кластара, шмат у чым залежаць ад асаблівасцей яго бізнэсу, хоць у цэлым могуць змяншацца выдаткі, павялічвацца гнуткасць і канкурэнтаздольнасць пры стварэнні новых прадуктаў, тэхналогій, засваенні новых рынкаў збыту прадукцыі» [3,с.48].

Большасць даследчыкаў і стваральнікаў навукова-адукацыйных кластараў адзначаюць наступныя цяжкасці ў іх функцыянаванні: доўгі працэс інтэграцыі адукацыйных арганізацый у кластар; пошук прадпрыемстваў галіны, зацікаўленай ва ўваходжанні ў кластар; размежаванне функцый яго структурных элементаў; розначытанні паміж тэрмінамі «кластар» і «кластарная палітыка», «кластарны» і «тэрытарыяльна-вытворчы комплекс», «кластар» ці «тэхналагічны парк» ці «прамысловыя раёны»; адсутнасць канчатковых мэт (напрыклад, падвышэнне прадукцыйнасці і экспарту, стварэнне новых працоўных месцаў і інш.). Залялова А.Г. у сваёй кандыдацкай дысертацыі адзначае, что «цяжкасці ў кіраванні кластарам могуць быць выкліканы некаторымі індывідуальнымі асаблівасцямі яе ўдзельнікаў, якія праяўляюцца ў няздольнасці да групавой дзейнасці». Важным фактарам з'яўляецца, як правіла, нежаданне губляць самастойнасць пры ўваходжанні ў кластар. Цяжкасці могуць быць злучаны з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адсутнасцю навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці навукова-адукацыйнага кластара [4, с. 27].

Навукова-метадычнае забеспячэнне функцыянавання кластараў па сваёй сутнасці прадугледжвае забеспячэнне перадавой методыкай адмыслоўцаў адукацыйных арганізацый-удзельнікаў кластара, а таксама можа ўяўляць сабою сістэму ўзаемазлучаных прафесійных педагагічных супольнасцей, аб'яднаных адзін з адным агульнай метадычнай тэмай і партнёрскімі адносінамі; гэта сістэма навучання, узаемнага навучання і саманавучання выкладчыкаў; канструкцыя, якая забяспечвае сінхранізацыю камунікацый і працэсаў па павышэнні прафесійнага ўзроўня выкладчыкаў (малюнак 1).




Малюнак 1 – Віды навукова-метадычнага забеспячэння

Вынікамі рэалізацыі навукова-метадычнага забеспячэння з'яўляюцца: стварэнне адзінага інфармацыйна-метадычнага асяроддзя для абмену метадычнымі рэсурсамі, у якое ўваходзіць сістэма кансультавання, маніторынгу, тэставанні і інтэрактыўнага ўзаемадзеяння выкладчыкаў; правядзенне відэаканферэнцый; распрацоўка кансультацыйных тэкстаў; абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы адукацыйных арганізацый. Навукова-метадычнае забеспячэнне навукова-адукацыйных кластараў па сваёй сутнасці прадугледжвае стварэнне ўмоў для забеспячэння перадавой методыкай адмыслоўцаў адукацыйных арганізацый-удзельнікаў кластара. Яно таксама можа ўяўляць сабою сістэму ўзаемазлучаных прафесійных педагагічных супольнасцей, аб'яднаных партнёрскімі адносінамі і

агульнай метадычнай тэмай.

**Літаратура**

1. Гарифуллина, Р. Р. Научно-методическое обеспечения регионально- отраслевого кластера / Р. Р. Гарифуллина, Г. У. Матушанский // Вестник Казанского государственного энергетического университета. – 2013. – №2 (17).
– С. 89-100.

2. Калашников, Д. И. Управление формированием кластеров в регионе: автореф. дис. … канд. экон. наук: 08.00.05/ Д. И. Калашников. – Воронеж, 2012. – 25 с.

3. Калашников, Д. И. Формирование кластера в образовательном секторе: предпосылки и перспективы / Д. И. Калашников // Финансы. Экономика. Стратегия. Серия «Инновационная экономика: человеческое измерение». – 2012. – № 1 (50). – С.47-50.

4. Залялова, А. Г. Региональная модель подготовки педагогических кадров в условиях образовательного кластера: дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01 / А. Р. Залялова. – Казань, 2010. – 216 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ